# З НОВЫМ НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДАМ!

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 1 (546) | Субота, 3 верасня 1983 года | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

**Першага верасня ранкам ля вучэбнага корпуса № 1 адбылося традыцыйнае пасвячэнне першакурснікаў у студэнты. Для тых, хто атрымаў магчымасць набываць вышэйшую адукацыю ў вядучай навучальнай установе Беларускага Палесся, гэты дзень запамятаецца на многія гады.**

**Фотарэпартаж з урачыстага ўступлення першакурснікаў у дружную студэнцкую сям'ю будзе змешчаны ў наступным нумары нашай газеты.**

# НАШ ПЕРШАКУРСНІК: ХТО ЁН?

КОЖНЫ год 1-га верасня задаёмся мы гэтым пытаннем, калі глядзім на новае папаўненне вялікай студэнцкай сям'і Гомельскага дзяржаўнага універсітэта. Глядзім на радасныя, шчаслівыя твары юнакоў і дзяўчат, якія нядаўна перажылі хваляванні ўступных экзаменаў і адчулі сябе акрыленымі, калі ўбачылі свае прозвішчы ў спісе залічаных на першы курс універсітэта. Цяпер яны — студэнты!

Першакурснікамі нашага універсітэта сёлета стала 750 учарашніх школьнікаў, былых воінаў, маладых рабочых. У параўнанні з леташнім набор зменшыўся на 50 чалавек: па 25 — на геафак і аддзяленне арганізацыі механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі.

У ліку першых, хто быў залічаны ва універсітэт, сталі 67 выпускнікоў яго падрыхтоўчага аддзялення. На астатнія 683 месцы было пададзена 1382 заявы. Гэта крыху больш двух чалавек на месца. Такім чынам, конкурс адпавядаў мінулагодняму. Сярэдні бал атэстатаў абітурыентаў склаў 4,49 — на адну сотую вышэй, чым у папярэднім годзе. Характэрна, што сярэдні бал паступаючых ва універсітэт з кожным годам павышаецца. Самы высокі конкурс — 3,4 чалавека на месца быў на аддзяленне эканомікі працы, 2,8 — на гістарычнае аддзяленне, 2,7 — на факультэт фізвыхавання, 2,4 — на біяфак і аддзяленне АМАЭІ, 2,1 — на аддзяленне рускай мовы і літаратуры, 2 — на геалагічны факультэт, 1,8 — на аддзяленне беларускай і рускай мовы і літаратуры, 1,6— на спецыяльнасць прыкладная матэматыка, 1,8 — на фізічны факультэт і спецыяльнасць матэматыка. Дарэчы заўважыць, што сёлета конкурс узрос на спецыяльнасці «эканоміка працы», «біялогія», «беларуская і руская мова і літаратура», АМАЭІ, а на астатніх ён застаўся на мінулагоднім узроўні або знізіўся. Значна менш было жадаючых паступаць на спецыяльнасць «прыкладная матэматыка». Гэта вынік таго, што на матэматычным факультэце не дабіліся, каб на спецыялістаў гэтага профілю быў шырокі попыт.

У 595 абітурыентаў сярэдні бал атэстатаў быў 4,5 і 5,0. Ва універсітэт паступіла 112 медалістаў і 45 выдатнікаў тэхнікумаў і прафесіянальна-тэхнічных вучылішчаў. Гэта некалькі больш, чым у мінулым годзе.

Па эксперыменту экзамены здавала 570 абітурыентаў. Аднак толькі 259 з іх атрымалі права быць залічанымі пасля двух экзаменаў. Гэта значна менш, чым летась. Пераважная большасць медалістаў пацвердзіла свае глыбокія веды ўжо на першым экзамене і не здавала астатнія. Менш падрыхтаванымі да паступлення ва універсітэт аказаліся выдатнікі ПТВ.

Прахадны бал характарызуецца наступнымі паказчыкамі: эканоміка працы — 21,5 (летась — 20,5), аддзяленне гісторыі — 21,5 (20,5), АМАЭІ — 20,0 (19,5), аддзяленне рускай мовы і літаратуры — 19,5 (20), геалагічны факультэт — 19,5 (17,5), прыкладная матэматыка — 19,5 (20), біяфак— 19,0 (18,5), аддзяленне беларускай і рускай мовы і літаратуры — 18,0 (17,5), фізічны факультэт — 18,0 (17,5), матэматыка — 16,5 (18), фізічнае выхаванне — 27,5 (28).

Як і ў папярэднія гады, ва універсітэт паступала найбольшая колькасць абітурыентаў з г. Гомеля і Гомельшчыны. Сярод залічаных, у прыватнасці, 306 гамяльчан і 222 — з нашай вобласці, 113 першакурснікаў з іншых населеных пунктаў рэспублікі і толькі 44 — з-за яе межаў.

Нельга не звярнуць увагу і на тое, што ў нашым універсітэце з кожным годам сярод першакурснікаў павялічваецца колькасць дзяўчат і змяншаецца—юнакоў. Сёлета суадносіны складаюць адпаведна 557 і 193 (летась — 545 і 255).

Сярод залічаных на першы курс 45 юнакоў, якія ўжо адслужылі ў радах Савецкай Арміі, 221 чалавек атрымаў пэўную працоўную загартоўку, 73 накіравана на вучобу прадпрыемствамі і арганізацыямі.

За лік першакурснікаў на 16 чалавек (летась — на 10) павялічылася партыйная арганізацыя універсітэта.

Сярод сёлетніх першакурснікаў пераважаюць беларусы — 73 працэнты, рускія — 20, украінцы — 6, іншых нацыянальнасцей — 1 працэнт. Першыя дзве лічбы абсалютна адпавядаюць мінулагоднім. На адзін працэнт прыбавілася ўкраінцаў — юнакоў і дзяўчат з суседняй братняй рэспублікі.

Сёлета, як і ў папярэднія гады, уступныя экзамены ў цэлым прайшлі арганізавана, патрабавальна і добразычліва — ў адпаведнасці з рэкамендацыямі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР. Пацвярджэннем таму— адсутнасць аргументаваных апеляцый.

У дружную студэнцкую сям'ю улілося 326 дзяцей рабочых, 367 — служачых, 57 — калгаснікаў. Сярэдні атэстат залічаных на першы курс складае 4,57. Гэта лічба ў пэўнай ступені сведчыць аб тым, што да нас прыйшло папаўненне з добрай школьнай падрыхтоўкай, з вялікім жаданнем набыць абраную спецыяльнасць. І прафесарска-выкладчыцкі састаў універсітэта з усёй шчодрасцю будзе перадаваць сёлетнім першакурснікам свае багатыя веды, выхоўваць іх у духу камуністычнай маралі, каб праз пяць гадоў стараннай вучобы і актыўнай грамадскай дзейнасці са сцен ГДУ яны выйшлі высокакваліфікаванымі і ідэйна загартаванымі спецыялістамі!

**Т. ЯЗЭПАВА,**
**адказны сакратар прыёмнай камісіі.**

## У ПАРТКОМЕ

На гэтым тыдні адбылося першае ў бягучым навучальным годзе пасяджэнне партыйнага камітэта. На яго парадку асноўным было пытанне «Аб задачах партарганізацый, дэканатаў, кафедр і лабараторый, вынікаючых з пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па паскарэнню навукова-тэхнічнага прагрэсу ў народнай гаспадарцы». З дакладамі выступілі намеснік загадчыка навукова-даследчага сектара С. Я. Пашук і член парткома, загадчык кафедры оптыкі А. М. Сердзюкоў.

Па абмеркаванаму пытанню прынята адпаведная пастанова.

Партыйны камітэт разгледзеў кадравыя і некаторыя іншыя пытанні ўніверсітэцкага жыцця.

## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

На гэтым тыдні адбылося пасяджэнне Савета універсітэта. Аб гатоўнасці ГДУ да новага навучальнага года далажылі на Савеце загадчыца бібліятэкі **В. М. Касцючэнкава**, прарэктар па АГР **В. А. Шаўчэнка**, загадчыца вучэбнага аддзела **Н. І. Папкова.**

На Савеце зацверджаны ўдакладнены перспектыўны план тэхнічнага пераасначэння універсітэта на 1983—1985 гг. і мерапрыемствы па правядзенню на базе нашага універсітэта рэспубліканскага навукова-метадычнага семінара прарэктараў па вучэбнай рабоце ВНУ.

Прарэктар па вучэбнай рабоце, член-карэспандэнт АН БССР **Л. А. Шамяткоў** выступіў са справаздачай аб камандзіроўцы ў ПНР на міжнародны матэматычны кангрэс.

На Савеце выбраны на вакантныя і перавыбраны на займаемыя пасады прафесарска-выкладчыцкі састаў. Разгледжаны іншыя пытанні універсітэцкага жыцця.

У рабоце Савета універсітэта прынялі ўдзел загадчык адзела навукі і навучальных установ ЦК КПБ Ю. П. Смірноў і загадчык аддзела навукі і навучальных установ абласнога камітэта партыі Б. М. Збароўскі.

*Слова—першакурсніцы*

## МАРА ЗДЗЕЙСНІЛАСЯ

Так атрымалася, што я нядоўга вагалася, кім мне быць пасля заканчэння школы.

Прафесія настаўніка ў нашай сям'і, можна сказаць, традыцыйная. Адзін дзядуля, Васіль Ануфрыевіч Цобанаў, доўгі час быў дырэктарам Баравікоўскай сярэдняй школы Светлагорскага раёна. Там жа мая бабуля, Ганна Якаўлеўна, трыццаць сем гадоў працавала настаўніцай пачатковых класаў. Другі дзядуля, Мікалай Назаравіч Воінаў, і цяпер працуе настаўнікам Канічаўскай пачатковай школы Веткаўскага раёна. Ён — выдатнік асветы СССР і БССР, а вопыт яго работы неаднаразова абагульняўся Міністэрствам асветы БССР. Мае бацькі закончылі Гомельскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя В. П. Чкалава. Яны і сёння выхоўваюць падрастаючае пакаленне. А калі падлічыць, то ў нашай сямейнай дынастыі працуе 14 педагогаў. Іх агульны стаж па навучанню і выхаванню дзяцей складае 250 гадоў.

Няма больш мірнай і ганаровай прафесіі, чым настаўнік. Менавіта ад настаўніка залежыць выхаванне актыўнай жыццевай пазіцыі кожнага чалавека. Ён вучыць разумець прыгожае, выхоўвае лепшыя маральныя якасці, прывівае любоў да нашай сацыялістычнай Радзімы.

Сёння над намі мірнае неба, і я мару прысвяціць сваё жыццё самай гуманнай, ганаровай, але вельмі адказнай прафесіі. Я надзвычай шчаслівая, што ў год саракавой гадавіны вызвалення Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў стала студэнткай адной з вядучых навучальных устаноў Беларускага Палесся.

**А. ВОІНАВА,**
**студэнтка гісторыка-філалагічнага факультэта.**



На кафедры беларускай мовы ўжо з першага курса студэнты актыўна далучаюцца да навукова-даследчай работы, паглыбленага вывучэння багатых крыніц роднай мовы.

На здымку: загадчык кафедры беларускай мовы заслужаны дзеяч навукі БССР, прафесар У. В. Анічэнка сярод членаў навуковага гуртка па беларускаму мовазнаўству. Абмяркоўваюцца вынікі работы над слоўнікам мовы Янкі Купалы.

Фота К. Дамітэркі.

